**EVDOKIMOVA T.V. The participation of social democrats in governing the state during weimar period: difficulties and contradictions**

The author shows that during Weimar period SPD was not able to transform its political will to the area of practical activities, directed at the enlargement of democracy. Its struggle for social equality and political freedom, constitutional state and mutual understanding between nations failed not only because of contradictions with its political opponents, but also because of its own insufficiency. Contradictions between revolutionary theory and reformist practice were resulting in positions unconformity of party leaders and SPD representatives in state governing bodies. The absence of strong political leader, as an activities coordinator, was aggravating the situation and was weakening party's authority throughout society overall.

УДК 310.05

***Грыбава С.У.***

# БЕЛАРУСКІЯ ТАТАРЫ ПАДЧАС ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ: ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМЫ

**Уводзіны.** Даволі шырока ў гістарыяграфіі прадстаўлена гісторыя Вялікай Айчыннай вайны. Розныя яе аспекты асвятляюцца ў працах навукоўцаў. Пэўная ўвага ў савецкай і постсавецкай гістарыяграфіі надаецца патрыятычнаму і інтэрнацыянальнаму характару антыфашысцкай барацьбы народаў СССР, у тым ліку і на тэрыторыі Беларусі, існуюць даследаванні, дзе высвятляецца гісторыя нацыянальных меншасцей Беларусі падчас Вялікай Айчыннай вайны. Дадзены артыкул прысвечаны аналізу асвятлення ў гістарычнай навуцы гісторыі беларускіх татараў у ваенны перыяд.

У айчыннай гістарыяграфіі трэба звярнуць увагу на серыю кніг «Памяць». У некаторых з іх, прысвечаных раёнам, дзе кампактна размяшчалася(ецца) татарскае насельніцтва, можна знайсці некаторыя звесткі аб прадстаўніках дадзенай нацыянальнай меншасці ў гады вайны [1–8]. У калектыўнай працы «Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 гг.» у раздзеле, прысвечаным асаблівасцям нацыянальнай палітыкі акупантаў, аўтары не абышлі ўвагай і беларускіх татараў [9]. Дадзены матэрыял прадстаўляе сабой асноўныя моманты (якія датычацца мясцовых мусульман) працы А.А. Кавалені «Прагерманскія саюзы моладзі на Беларусі 1941–1944. Вытокі. Структура. Дзейнасць» [10]. У ёй аўтар на падставе звестак з архіва КДБ, НАРБ разглядае ўзаемаадносіны паміж акупацыйнымі ўладамі Генеральнай акругі Беларусь, Генеральнай акругі Літва (ГАЛ) і мусульманскім духавенствам на вызначанай тэрыторыі. Ён засяроджвае ўвагу на працэсе стварэння пранямецкага Саюза татарскай моладзі (СТМ), татарскіх камітэтаў. З пункту гледжання даследчыка, ініцыятыва ў арганізацыі дадзеных калабарацыйных арганізацый належала татарска-мусульманскім лідэрам, якія з самага пачатку вайны імкнуліся да супрацоўніцтва з акупацыйнымі ўладамі. Аўтар падкрэслівае вялікую актыўнасць, настойлівасць, а месцамі нават ваяўнічасць прадстаўнікоў мясцовых татараў у памкненнях да рэалізацыі сваіх планаў у дадзеным кірунку [10, с. 165–171]. У публікацыях Х.М. Александровіча прадстаўлены процілеглы пункт гледжання на вызначаную праблему: «Этот Союз существовал номинально только в умах отдельных, очень немногих представителей татарского муфтията в г. Вильнюсе, а также после освобождения Западной Беларуси Советской Армией в головах сотрудников Госбезопасности, которые, выдавая желаемое за действительное, утверждали, что в городах Беларуси с татарским населением в период оккупации существовала разветвленная сеть молодежной профашистски настроенной татарской организации, которая представляла огромную опасность советскому государству» [11, с. 21]. Х.М. Александровіч сцвярджае наступнае: «Да, Х. Якубовский (будучы начальнік штаба Саюза ў ГАБ. – С.Г.) неоднократно приезжал в 1943–1944 гг. с женой в город Клецк, но не для агитации и организации СТМ, а посещал родителей своей жены Тамары Богушевич, на которой был женат с 1943 г. И только в узком кругу своей семьи высказывал, как крамольную, мысль об объединении татар в какую-нибудь татарскую организацию <…>». [11, с. 21]. Х.М. Александровіч піша аб тым, што муфцiя Якуба Шынкевіча татары ведалі як глыбока веруючага, добра адукаванага чалавека, далёкага ад палітычнага жыцця. Яго пранямецкія выказванні падчас акупацыі трэба расцэньваць не як вынік яго ўнутраных перакананняў, а як вымушаныя ў сувязі з яго службай і займаемай пасадай [11, с. 22–23]. Зразумела, што дадзеныя высновы нельга ўспрымаць без адпаведнай крытыкі, аднак пэўную рацыю аўтар мае: нельга і перабольшваць удзел прадстаўнікоў татарскага насельніцтва ў калабарацыйных працэсах.

Дзейнасць муфціята напярэдадні і падчас Другой сусветнай вайны разглядаецца ў публікацыях польскага даследчыка С. Хазбіевіча, які не адмаўляе яго палітычнай і прапагандысцкай дзейнасці, адзначаючы сувязь муфціята ў Вільні з дзейнасцю татарскіх лідэраў у Крыме. Аднак аўтар пазначае, што менавіта германскія ўлады падштурхоўвалі муфція да супрацоўніцтва з імі [12]. Вядомы польскі даследчык гісторыі польска-беларуска-літоўскіх татараў Я. Тышкевіч у працы «З гісторыі татараў польскіх 1794–1944 гг.» у раздзеле, прысвечаным польскім татарскім дзеячам у 1925–1944 гг., прыводзіць біяграфічныя дадзеныя, разглядае дзейнасць Леона, Альгерда і Станіслава Крычынскіх, Алі Варановіча, а таксама муфція Якуба Шынкевіча. Аўтар звяртае ўвагу на «марыянетачнасць» створанага акупантамі муфціята «Остланда» і фармальнасць пасады Я. Шынкевіча, які пад націскам нямецка-фашысцкіх улад вымушаны быў ім падпарадкоўвацца [13]. Пытанне стварэння муфціята ў грунтоўнай працы «Коллаборационистское движение среди тюрко-мусульманских военнопленных и эмигрантов в годы Второй мировой войны» закранае расійскі даследчык І. Гілязаў. Аўтар прыводзіць звесткі аб намаганнях Я. Шынкевіча ў распаўсюджванні свайго ўплыву як муфція не толькі на тэрыторыі Літвы, дзе ён першапачаткова быў прызначаны на дадзеную пасаду, а таксама на тэрыторыю Беларусі і Польшчы. У манаграфіі І. Гілязаў аналізуе матывы, формы, дае агульную характарыстыку такой шматграннай з'явы, як калабарацыянізм падчас Другой сусветнай вайны ў цэлым і савецкі калабарацыянізм у прыватнасці. Аўтар разглядае такія пытанні, як палітычныя перадумовы перацягвання на свой бок Германіяй татарска-мусульманскіх народаў СССР, стварэнне і дзейнасць усходніх легіёнаў вермахта і іншых ваенных фарміраванняў з палонных чырвонаармейцаў – прадстаўнікоў Каўказа, Сярэдняй Азіі, Паволжа і Прыўралля, праблемы супрацоўніцтва германскіх інстанцый з даваеннай цюркска-мусульманскай эміграцыяй, палітыка-ідэалагічная праца нямецкіх органаў, роля ісламскага фактара ва ўмовах вайны [14–15].

Неабходна больш падрабязна спыніцца на працы Д.А. Крывашэя «Нацыянальныя супольнасці Беларусі ў перыяд германскай акупацыі», дзе аўтар асобны падраздзел прысвячае палітыцы акупацыйных улад у дачыненні да мясцовага татарскага насельніцтва. Гісторык асвятляе дадзенае пытанне ў большасці абапіраючыся на архіўныя матэрыялы, якія ён уводзіць у навуковы ўжытак. Безумоўна, трэба адзначыць вялікую каштоўнасць гэтых звестак. Аўтар спрабуе высветліць колькасць татарскага насельніцтва ў ГАБ, прыводзіць звесткі аб духоўнай дзейнасці муфція Я. Шынкевіча. Аналізуючы стаўленне татараў да акупацыйных улад, Д.А. Крывашэй прыходзіць да высновы, што «ў значнай меры апалітычнасць гэтага насельніцтва прадухіліла першапачатковыя планы германскай адміністрацыі аб высяленні татараў у Сярэднюю Азію» [16, с. 159]. У той жа час неабходна пазначыць адпаведную павярхоўнасць і недакладнасць у выкарыстанні некаторых матэрыялаў. Так, напрыклад, аўтар, разглядаючы рэлігійнае жыццё татарскай супольнасці ў гады

***Грибова Светлана Владимировна**, ст. преподаватель кафедры социально-политических и исторических наук Брестского государственного технического университета.*

*Беларусь, БрГТУ, 224017, г. Брест, ул. Московская, 267.*

разглядаючы рэлігійнае жыццё татарскай супольнасці ў гады акупацыі, піша аб тым, што «кіраўнікамі абшчын усюды былі муфціі. У асобных мясцовасцях, такіх як Глыбокае, Слонім, Слуцк, былі свае святары (імамы)» [16, с. 152]. Аднак зразумела, што муфцій не ўзначальваў татарскія абшчыны, бо гэта значна вышэйшая духоўная пасада, якой падпарадкоўваліся мусульмане адлаведнага рэгіёну, аб чым аўтар, супярэчачы сабе, піша ў наступным сказе: «Вышэйстаячай духоўнай інстанцыяй у польскія часы быў муфцій у Вільнюсе, які падпарадкоўваўся галаве мусульманскага свету вялікаму муфцію Іерусаліма» [16, с. 152]. Д.А. Крывашэй таксама памылкова згадвае, што «існаваўшая раней у Слуцку мячэць была разбурана бальшавікамі» [16, с. 152]. Аднак мячэці ў Слуцку ніколі не было. Верыфікуючы архіўныя матэрыялы, становіцца зразумелым, што ў дакуменце маецца на ўвазе мячэць у Капылі, які па акупацыйнаму адміністрацыйнаму падзелу знаходзіўся ў Слуцкай акрузе. Можна пазначыць таксама некаторую павярхоўнасць у падачы звестак аб размяшчэнні татарскага насельніцтва. Даследчык сцвярджае, што татары былі сканцэнтраваны на поўначы Беларусі – у Баранавічах, на захадзе – у Навагрудку і Лідзе [16, с. 152]. Аднак татары ў Лідскай акрузе пражывалі толькі ў м. Іўе, у Баранавіцкай акрузе яны размяшчаліся ў асноўным у Клецку і Ляхавічах. Можна таксама адзначыць некаторую блытаніну, якая датычыцца паслядоўнасці загадаў акупацыйных улад у дачыненні да татарска-мусульманскага насельніцтва. Аднак у цэлым вызначаныя недакладнасці не з'яўляюцца прынцыповымі і на агульныя высновы, да якіх прыходзіць аўтар, не ўплываюць.

Пэўную ўвагу беларускім татарам у падзеях Другой сусветнай вайны надае Л.М. Лыч у сваёй працы «Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (XX – пачатак XXI ст.)». Аўтар даволі кампліментарна прадстаўляе татарскае насельніцтва падчас Вялікай Айчыннай вайны. Вызначае ўвесь трагізм ваеннага ліхалецця і звяртае ўвагу на гераізм мясцовых татараў у барацьбе супраць ворага [17].

Варта адзначыць шэраг публікацый у айчыннай гістарыяграфіі, якія прысвечаны непасрэдна антыфашысцкай дзейнасці прадстаўнікоў татарскай нацыянальнасці, у тым ліку беларускім татарам. Першымі да распрацоўкі дадзенага пытання звярнуліся такія даследчыкі, як А.А. Каваленя, Э.Р. Іофе. У артыкуле «Да пытання ўдзелу татараў у партызанскім руху на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны» А.А. Каваленя на падставе працы з архіўнымі крыніцамі пяці партызанскіх брыгад выяўляе некаторыя тэндэнцыі ўдзелу ў партызанскай барацьбе прадстаўнікоў татарскага народа, а таксама адзначае, што «патрэбна глыбокае, мэтанакіраванае даследаванне татараў у партызанскім руху на захопленай ворагам тэрыторыі Беларусі, якое дасць больш поўную і аб'ектыўную карціну развіцця партызанскай барацьбы на беларускай зямлі» [18, с. 509]. Э.Р. Іофе ў артыкуле «К вопросу об участии татар в Великой Отечественной войне на территории Беларуси» падрабязна разглядае, прыводзіць невядомыя і малавядомыя звесткі аб дзейнасці ў Мінскім падполлі наборшчыка газеты «Звязда» беларускага татарына Хасеня Александровіча [19]. Пэўны ўклад у распрацоўку пытання антыфашысцкай барацьбы беларускіх татараў зрабіў у сваіх публікацыях і вядомы айчынны даследчык гісторыі беларускіх татараў І.Б. Канапацкі [20–22].

У публікацыях Х.М. Александровіча шмат увагі надаецца антыфашысцкай дзейнасці беларускіх татараў падчас Другой сусветнай вайны [23–27]. У прыватнасці, у артыкуле «Татары клецкого джамията в годы Второй мировой войны» аўтар прыводзіць звесткі аб лёсах прадстаўнікоў Клецкай татарскай абшчыны, якія былі мабілізаваны і змагаліся з ворагам у складзе Чырвонай Арміі і Войска Польскага падчас Вялікай Айчыннай вайны, а таксама ў складзе 1-га татарскага эскадрона 13-га палка Віленскіх уланаў і арміі Уладыслава Андэрса на франтах Другой сусветнай вайны [25].

У польскай гістарычнай навуцы даследаваннем пытанняў гісторыі польска-беларускіх татараў у XX ст. займаецца А. Міськевіч. Яму належыць і шэраг публікацый, у якіх утрымліваецца інфармацыя аб татарскім насельніцтве ў перыяд Другой сусветнай вайны [28–31].

Асобна трэба вызначыць перыядычны друк татарска-мусульманскай дыяспары Беларусі, а менавіта квартальнік «Байрам. Татары на зямлі Беларусі». На сённяшні дзень выйшла 42 нумары, у якіх змешчана больш за сто розных па памеру матэрыялаў, прысвечаных ваенным падзеям. У часопісах прадстаўлены публікацыі, якія датычацца ўдзелу татараў у партызанскім руху, іх дзейнасці ў падполлі, добра выкладзена баявая садружнасць татараў з розных рэгіёнаў Савецкага Саюза, аб чым сведчаць нават назвы артыкулаў: Я. Якубоўскі «Йозас Янушоўскас – наш брат-мусульманін з Летувы» (1992, № 3) [32]; «Успаміны Ібрагіма Смайкевіча – імама Віленскай мячэці» (1993, № 1–2) [33]; І. Меметаў «Беларусь мне вядома з 1944 г.: тут давялося мне ваяваць і жыць (расказ крымскага татарына)» (1994, № 2) [34]; персаналія «Талівалдыеў Мамедалі» (1996, № 1–2) [35] і інш. Вельмі багата прадстаўлены персаналіі франтавікоў, вядзецца храналогія памерлых абаронцаў беларускай зямлі. Калектывам рэдакцыі для адлюстравання гісторыі Вялікай Айчыннай вайны шырока выкарыстаны розныя жанры. Сярод аўтараў матэрыялаў часопіса можна вызначыць Я. Якубоўскага, І. Канапацкага, Х. Александровіча, Р. Александровіч, А. Асановіч і інш.

**Заключэнне.** Такім чынам, асобныя аспекты гісторыі беларускіх татараў падчас Вялікай Айчыннай вайны прадстаўлены ў большай ці меншай ступені ў айчыннай, польскай і расійскай гістарыяграфіі. Аднак відавочна, што комплекснага, рознабаковага даследавання дадзенай праблематыкі ў гістарычнай навуцы да сённяшняга часу не існуе. Маюцца толькі асобныя публікацыі, у якіх разглядаюцца пэўныя аспекты дадзенай тэматыкі, а ў шматлікай літаратуры па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны пазначанае пытанне згадваецца толькі ў кантэксце больш шырокіх праблем.

## СПІС ЦЫТУЕМЫХ КРЫНІЦ


1. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Докшыцкага раёна / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск: БелЭН, 2004. – 752 с.
2. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Іўеўскага раёна / Рэдкал.: Г.К. Кісялеў [і інш.]. – Мінск: БЕЛТА, 2002. – 510 с.
3. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Клецкага раёна / Рэдкал.: А.М. Жукаўскі, М.С. Кусянкоў [і інш.]. – Мінск: Маст. літ., 1999. – 622 с.
4. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Мінскага раёна / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск: БелЭН, 1998. – 640 с.
5. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Навагрудскага раёна / Рэдкал.: Э.Н. Гнеўка [і інш.]. – Мінск: Беларусь, 1996. – 559 с.
6. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Слонімскага раёна / Рэдкал.: М.Б. Касцюк [і інш.]. – Мінск: БЕЛТА, 2004. – 752 с.
7. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Уздзенскага раёна / Рэдкал.: Г.К. Кісялеў [і інш.]. – Мінск: БЕЛТА, 2003. – 656 с.
8. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Чэрвеньскага раёна / Рэдкал.: Г.К. Кісялеў [і інш.]. – Мінск: БЕЛТА, 2000. – 623 с.
9. Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 гг. / НАН Беларуси. ГНУ «Институт истории НАН Беларуси»; редкол.: А.А. Коваленя [и др.]. – Минск: БЕЛТА, 2005. – 544 с.
10. Каваленя, А. Прагерманскія саюзы моладзі на Беларусі 1941–1944. Вытокі. Структура. Дзейнасць / А. Каваленя. – Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 1999. – 234 с.
11. Александрович, Х.М. О союзе татарской молодежи в период фашистской оккупации Беларуси / Х. Александрович // Байрам. – 1999. – № 4. – С. 8–25.
12. Chazbijewicz, S. Tatary polsko-litewscy w latach II wojny swiatowej / S. Chazbijewicz // Meandry cywilizacyjne, kwestie narodowosciowe i polonijne. – Wydanie II. – 1997.– S. 91–98.
13. Tyszkiewicz, J. Z historii tatarow polskich 1794–1944 / J. Tyszkiewicz. – Pultusk, 1998. – 176 s.
14. Гилязов, И.А. Военно-политический коллаборационизм тюркско-мусульманских народов СССР в годы Второй мировой войны : автореф. дис. ... д-ра ист. наук : 07.00.02 / И.А. Гилязов ; Казанский гос. ун-т. – Казань, 1999. – 27 с.
15. Гилязов, И.А. Коллаборационистское движение среди тюркско-мусульманских военнопленных и эмигрантов в годы Второй мировой войны : дис. ... д-ра ист. наук : 07.00.02 / И.А. Гилязов. – Казань, 2000. – 400 л.
16. Крывашэй, Д.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі ў перыяд германскай акупацыі (чэрвень 1941 – ліпень 1944 г. ) / Д.А. Крывашэй. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 198 с.
17. Лыч, Л.М. Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (XX – пачатак XXI ст.) / Л.М. Лыч. – Мінск : Кнігазбор, 2007. – 76 с.

18. Каваленя, А. Да пытання ўдзелу татараў у партызанскім руху на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны / А. Каваленя // Татары-мусульмане на землях Беларусі, Літвы і Польшчы : матэрыялы Першай міжнар. навук.-практ. канф., прысвеч. да 600-годдзя татарскага асадніцтва на землях Беларуска-Літоўскай дзяржавы, распачатага пры Вітаўце Вялікім, Мінск, 26–27 сак. 1993 г. : у 3 ч. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: І. Александровіч [і інш.]. – Мінск, 1995. – Ч. 3. – С. 505–510.
19. Иоффе, Э.Г. К вопросу об участии татар в Великой Отечественной войне на территории Беларуси / Э.Г. Иоффе // Ісламская культура татараў-мусульман Беларусі, Літвы і Польшчы і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі : матэрыялы другой міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 19–20 мая 1995 г. : у 2 ч. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: І. Канапацкі [і інш]. – Мінск, 1996. – Ч.1. – С. 130–137.
20. Канапацкі, І.Б. Да пытання ўдзелу мусульман у барацьбе беларускага народа супраць фашысцкіх захопнікаў у гады Другой сусветнай вайны / І.Б. Канапацкі // Вызваленне Беларусі ад германскіх акупантаў (восень 1943 – лета 1944 гг.): матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 29 крас. 2004 г. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]. – Мінск, 2004 – С. 99–105.
21. Канапацкі, І.Б. Удзел народаў Савецкага Саюза ў Вялікай Айчыннай вайне (чэрвень 1941 – май 1945 гг.) / І.Б. Канапацкі, Л.Л. Шкуцько, П.Л. Шкуцько // Участие тюркских народов и народов Кавказа в Великой Отечественной войне 1941–1945 гг. : материалы X междунар. науч.-практ. конф., Минск, 2–3 сентября 2004 г. / Белорус. гос. пед. ун-т ; редкол.: И.Б. Канапацкий [и др.]. – Минск, 2004 – С. 33–38.
22. Канапацкі, І.Б. Удзел татараў у Вялікай Айчыннай вайне на тэрыторыі Беларусі / І.Б. Канапацкі // Народы СССР в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 гг. (к 60-летию Победы советского народа в Великой Отечественной войне): материалы XI междунар. науч.-практ. конф., Минск, 30–31 мая 2005 г. / Белорус. гос. пед. ун-т; редкол.: З.И. Канапацкая [и др.]. – Минск, 2006. – С. 263–278.
23. Александрович, Х.М. Татары в книгах «Памяць» районов их проживания / Х.М. Александрович // Жизнь, Жыццё татарскае. – 2002. – № 4. – С. 3–4.
24. Александрович, Х.М. Татары в книгах «Памяць» районов их проживания / Х.М. Александрович // Жизнь, Жыццё татарскае. – 2003. – № 5. – С. 2–3.
25. Александрович, Х.М. Татары клецкого джамията в годы Второй мировой войны / Х.М. Александрович // Участие тюркских народов и народов Кавказа в Великой Отечественной войне 1941–1945 гг.: материалы X междунар. науч.-практ. конф., Минск, 2–3 сент. 2004 г. / Белорус. гос. пед. ун-т ; редкол.: И.Б. Канапацкий [и др.]. – Минск, 2004. – С. 124–149.
26. Александрович, Х.М. Юбилей Ромуальда Соболевского (к 80-летию со дня рождения) / Х.М. Александрович // Жизнь. – 2003. – № 4(100). –С. 6–7.
27. Aleksandrowicz, Ch. Ksiega pamieci. Z okazji 60-lecia wyzwolenia Bialorusi, z wyciestwa w Wielkiej wojnie ojczyznianej i 120-lecia pierwszego meczetu w Klecku / Ch. Aleksandrowicz // Rocznik tatarow Polskich. – 2006. – № 11. – S. 69–107.
28. Miskiewicz, A. Polegli za Polske. O Tatarach polskich zamordowanych I zaginionych podczas Drugej wojny swiatowej / A. Miskiewicz // Nasz Dzennik. – 2002. – 2–3 listop. – S. 4–5.
29. Miskiewicz, A. Tatarska legenda: tatarzy polscy 1945–1990 / A. Miskiewicz. – Bialystok : Krajowa Agencja wydawnicza, 1993. – 123 s.
30. Miskiewicz, A. Tatarzy polscy 1918–1980 / A. Miskiewicz // Novum. – 1980. – № 8. – S. 83–107.
31. Miskiewicz, A. Tatarzy polscy w latach 1945–1985. Zarys historyczny / A. Miskiewicz // Studia Podlaskie. – 1991. – T. III – S. 99–140.
32. Якубоўскі, Я. Йозас Янушоўскас – наш брат-мусульманін з Летувы / Я. Якубоўскі // Байрам. – 1992. – № 3. – С. 31–33.
33. Успаміны Ібрагіма Смайкевіча – імама Віленскай мячэці // Байрам. – 1993. – № 1–2. – С. 75–76.
34. Меметаў І. Беларусь мне вядома з 1944 г.: тут давялося мне ваяваць і жыць (расказ крымскага татарына) / І. Меметаў // Байрам. – 1994. – № 2. – С. 19–22.
35. Персаналія Тапівалдыева Мамедалі // Байрам. – 1996. – № 1–2. – С. 62.

*Материал поступил в редакцию 30.09.11*

**GRIBOVA S.V. Byelorussian tartar during Great domestic war: historiography of a problem**

In this article we review the studies of Belarusian Tatars' history during the Great Patriotic War. The article draws attention to the lighting in the historiography of such problematic issues as anti-fascist struggle of the Tatars of Belarus, their attitude towards the occupation regime, muftiat's activities, the policy of the occupation authorities against the local Tatar-Muslim population. Based on the analysis of Belarusianl, Polish, Russian historiography on the subject, the author concludes that an integrated, versatile research of the history of Belarusian Tatars during the Great Patriotic War in historical science still does not exist. There are only a few publications that cover specific aspects of the subject; the issue is only mentioned in the context of broader issues in various books devoted to the history of the Great Patriotic War.

УДК 323. 04

***Стрелец М.В.***

# ПОВОРОТНЫЙ ЭТАП В ИСТОРИИ НЕМЕЦКИХ ЕВРЕЕВ

**Введение.** Тема, совпадающая с названием настоящей статьи, никогда ранее не прослеживалась в творческих поисках отечественных историков. Поэтому её автор решил восполнить соответствующий пробел. Он попытался выяснить ключевые детерминанты, общие тенденции, региональные особенности правового положения немецких евреев с эпохи Просвещения до первого объединения Германии, которое произошло в 1871 году.

В начале освещения анализируемого вопроса принципиально важно отметить следующее. В германских государствах в течение XVIII века существовали различные ограничения свободы передвижения, подушная или сопроводительная (конвойная) подать, меры против перемещения евреев, нормирование числа заключённых браков, экономические осложнения. Прослеживалась следующая тенденция в законодательстве (например, в генеральных регламентах в Пруссии 1730 и 1750 гг.): повышать пользу евреев для государства благодаря причитающимся от них сборам, уменьшать их мнимый вред разнообразными оковами.

С Просвещением вновь возник вопрос об интеграции и равноправии евреев, который до сих пор рассматривался под экономическим углом зрения. «Первым, кто его поставил, был Лессинг. Начиная с пьесы «Евреи» (1749), в которой он, вопреки традиции, вывел еврея как достойного человека, и кончая драмой «Натан Мудрый» (1779), пронизанной идеями веротерпимости и толерантности, он не уставал отстаивать идею человеческого равноправия» [1]. Видный деятель немецкой литературы «верил в то, что естественная эволюция общества приведет к решению «еврейского вопроса», улучшение положения евреев равнозначно прогрессу человечества» [1].